УДК 331.105

# Пераемнасць гістарычнага вопыту прафсаюзаў Беларусі ў рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін

Дубовік А. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У любым грамадстве рэгуляванне працоўных адносін мае першараднае значэнне, у многім уплывае на развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы. Важная роля ў гэтым традыцыйна належыць прафсаюзам – самай масавай арганізацыі працоўных. Сёння на першы план выходзяць задачы павышэння іх аўтарытэту, эфектыўнасці дзейнасці і стварэння дзейсных механізмаў абароны наёмных работнікаў. Эфектыўным сродкам у гэтым накірунку выступае сацыяльнае партнёрства як сістэма ўзаемадзеяння паміж прафсаюзамі, наймальнікамі і дзяржавай, якая абапіраецца на перамовы, заключэнне калектыўных дагавораў і пагадненняў, пошук узаемапрымальных рашэнняў у рэгуляванні працоўных і іншых сацыяльна-эканамічных адносін.

Практычнае ажыццяўленне задач рэгулявання сацыяльна-працоўных адносін патрабуе глыбокага аналізу і абагульнення гістарычнага вопыту, назапашанага дзяржаўнымі і прафсаюзнымі органамі Беларусі ў гады новай эканамічнай палітыкі (НЭПа), калі многія ўмовы ў эканамічнай і працоўнай сферах былі падобныя на сённяшнія. Прафесійныя саюзы ў перыяд НЭПа набылі багаты вопыт узаемадзеяння з дзяржаўнымі і гаспадарчымі органамі у калектыўна-дагаворным рэгуляванні працоўных адносін; абароны інтарэсаў і правоў рабочых і служачых, паляпшэння ўмоў іх працы і быту; змякчэння негатыўных наступстваў беспрацоўя. На працягу 20-х гг. формы і метады работы прафсаюзных арганізацый Беларусі мяняліся, часам дэфармаваліся, наносілі шкоду інтарэсам працоўных замест іх абароны. Таму сёння, калі ажыццяўляецца пераход ад планавай эканомікі да рыначнай, неабходна ўлічваць не толькі станоўчы вопыт, але і памылкі, перагібы і ненармальнасці ў рабоце прафсаюзных органаў, якія з’яўляліся вынікам адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання. Некаторыя суправаджаючыя гэты пераход негатыўныя працэсы (зніжэнне жыццёвага ўзроўню часткі насельніцтва, з’яўленне беспрацоўя, асобныя парушэнні правоў працоўных) дыктуюць неабходнасць выпрацоўкі збалансаванай палітыкі, накіраванай на забеспячэнне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўных. Таму вывучэнне гісторыі станаўлення партнёрскіх адносін у сацыяльна-працоўнай сферы паміж прафсаюзамі і дзяржавай у гады НЭПа мае безумоўную актуальнасць, дазваляе глыбей зразумець гістарычную пераемнасць сацыяльнага партнёрства як грамадска-палітычнай з’явы.